# Зацверджаны найважнейшыя параметры на 2024 год

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 2 кастрычніка падпісаў указ № 307, якім зацверджаны найважнейшыя прагнозныя параметры развіцця краіны на 2024 год, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Галоўнай мэтай эканамічнай палітыкі будучага года будуць забеспячэнне ўстойлівасці эканомікі і рост дабрабыту насельніцтва. Прырост валавога ўнутранага прадукту прагназуецца на 3,8% за кошт маштабных інвестыцыйна-вытворчых праграм, рэалізацыі беларускай прадукцыі на знешнія рынкі і пашырэння ўнутранага попыту.

Чакаецца, што інвестыцыі ў асноўны капітал дададуць 3,9% у супастаўных умовах, экспарт тавараў і паслуг павялічыцца на 7,6% (пераважна за кошт нарошчвання фізічных аб'ёмаў продажаў), рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва прырастуць на 3,5%.

Захаваецца палітыка па стрымліванні цэн. Для гэтага для Нацыянальнага банка і ўрада ўстанаўліваецца мэтавая задача па абмежаванні інфляцыі на ўзроўні, які не перавышае 6%.

У выніку рост рэальнай заработнай платы складзе 103,9%. Намінальная налічаная сярэднемесячная зарплата па краіне павялічыцца да Br2087. У бюджэтным сектары — Br1634.

Для дасягнення найважнейшых параметраў урад зацвердзіць Мэтавы план на 2024 год. У ім будуць сканцэнтраваныя першачарговыя задачы па рэалізацыі вытворчых, экспартных і інвестыцыйных планаў дзяржаўнымі органамі. Устаноўленыя ў ім заданні будуць нацэлены на збалансаваны рост эканомікі без рызыкі справаваць макраэканамічныя шокі пры спадарожным павышэнні ўзроўню жыцця насельніцтва.

**Таксама ў мэтах стварэння ўмоў для ўстойлівага росту эканомікі прыняты ўказ № 308 аб мэтавых паказчыках грашова-крэдытнай палітыкі на 2024 год.**

Пералік уключае набор якасных паказчыкаў, здольных забяспечыць устойлівасць банкаўскай сістэмы (у тым ліку як крыніцы інвестыцыйных рэсурсаў), а таксама цэнавую і фінансавую стабільнасць. Да іх адносяцца:

- прырост спажывецкіх цэн — не больш за 6%;
- міжнародныя рэзервовыя актывы — не менш за $ 6 млрд;
- доля неабслугоўваемых актываў банкаў у актывах, схільных да крэдытнай рызыкі, — не больш за 10% (утрыманне такога ўзроўню забяспечыць стабільнасць усёй банкаўскай сістэмы);
- каэфіцыент даступнасці аўтаматызаваных сістэм удзельнікаў плацежнага рынку для забеспячэння правядзення разліковых аперацый — не менш за 99,8% (гэта дазволіць паўнавартасна забяспечыць патрэба рэальнага сектара эканомікі і грамадзян у бесперашкодным правядзенні разлікаў на тэрыторыі краіны);
- прырост патрабаванняў банкаў да эканомікі — не менш за 10%, што пашырыць рэсурсную падтрымку рэальнага сектара, задаволіўшы плацежаздольны попыт на крэдыты, што стане адным з ключавых стымулаў росту эканомікі.

# «ЛЮДЗІ ХОЧУЦЬ БАЧЫЦЬ УЛАДУ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Найперш Прэзідэнт звярнуў увагу на заканатворчы працэс, у прыватнасці на яго асаблівасці падчас работы верхняй палаты парламента цяперашняга склікання, які праводзіць сваю апошнюю перад выбарамі сесію. «Магчыма, нейкія недахопы, нейкія асаблівасці, якія мы павінны ўлічыць пасля выбараў у будучыні», — заўважыў ён.

Другое пытанне, узнятае кіраўніком дзяржавы, датычыцца экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся: як сябе рэалізаваў гэты досвед, ці не стаў экспертны савет чыноўніцкім або ўрадавым прыдаткам? Экспертны савет пры Савеце Рэспублікі быў створаны для ўсебаковага разгляду праектаў найважнейшых нарматыўных прававых актаў і ацэнкі наступстваў іх прыняцця. «Мы дамаўляліся, што гэта будзе сур'ёзны фільтр з экспертаў па дакументах, якія вы выносіце на разгляд Прэзідэнта. Гэта вельмі важна, каб не разбалансаваць. Таму я думаю, што савет лішнім не будзе і бюракраты там таксама не павінна быць. Вось гэтага ні ў якім разе нельга дапусціць», — сказаў ён.

Трэцяе пытанне — узаемадзеянне Савета Рэспублікі з мясцовымі Саветамі. «Мы дамаўляліся аб тым, што Савет Рэспублікі возьме пад свой патранаж мясцовыя Саветы. Але гэта ўвогуле зона вашай адказнасці, акрамя заканатворчасці. Бо лепш, чым вы, Савет Рэспублікі, гэтую работу ніхто не зробіць. Як тут ідуць справы? Што трэба зрабіць у будучыні?» — пацікавіўся Прэзідэнт.

Чацвёртае пытанне і, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, вельмі гарачая тэма — выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў і Палату прадстаўнікоў. «Я прасіў бы вас найперш, Адміністрацыю Прэзідэнта, калі трэба, парламент (ніжнюю палату) падключыцца да правядзення гэтых выбараў. Тым больш вы — упаўнаважаны па Мінску. Мінск заўсёды ў нас адрозніваўся нейкай асаблівасцю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў пра размову аб тым, што трэба паглядзець, наколькі гатовы да правядзення выбараў усе органы ўлады, і пры неабходнасці дапамагчы Цэнтральнай выбарчай камісіі. «У нас няма такіх створаных бюракратычных сістэм, адміністрацыйных, якія займаліся б выбарамі, акрамя Цэнтральнай выбарчай камісіі. Астатнія, так сказаць, на аматарскіх пачатках. Таму гэта пытанне трэба трымаць пад кантролем, вопыт у вас ёсць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што інфармаваны наконт работы са зваротамі грамадзян у Савеце Рэспублікі. «Магу толькі падзякаваць сенатарам за тое, што, як ніякая іншая структура, вы сур'ёзна паставіліся да гэтага пытання. Людзі гэта цэняць, людзі хочуць бачыць уладу, людзі хочуць пагаварыць з прадстаўнікамі ўлады. Мы гэта нядрэнна робім», — сказаў ён. Па інфармацыі Савета Рэспублікі, у сесіённы перыяд сенатарамі праведзена звыш 200 прамых тэлефонных ліній, 360 асабістых прыёмаў грамадзян, каля паловы з якіх выязныя, разгледжана каля 6 тысяч зваротаў.

Наталля Качанава падкрэсліла, што Савет Рэспублікі самым сур'ёзным чынам працуе па кірунках, закранутых Прэзідэнтам, і па многіх іншых. «Для нас вельмі важная работа над законапраектамі. За мінулы перыяд мы разгледзелі 305 нарматыўна-прававых актаў, законапраектаў. За гэты год больш за 100, амаль 92 працэнты законаў прыведзены ў адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй», — дадала яна.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

❍ **У тэму**

## Дапамагчы людзям мы абавязаны

У размове з журналістамі Наталля Качанава падкрэсліла, што ў хуткім часе работа па прывядзенні законаў у адпаведнасць з Канстытуцыяй будзе скончана ў вызначаныя тэрміны.

Адной з тэм сустрэчы ў Прэзідэнта стала дзейнасць экспертнага і экспертна-кансультатыўнага саветаў пры Савеце Рэспублікі. Як адзначыла Наталля Качанава, гэта вельмі эфектыўныя структуры. За два гады дзейнасці экспертнага савета праведзена 108 пасяджэнняў, на іх разгледжана 225 дакументаў, з якіх падтрымана 65 (28,9 працэнта). Па 160 дакументах унесены заўвагі (71,1 працэнта), у тым ліку адхілена 13 дакументаў. У пасяджэннях экспертнага савета ўдзельнічаюць кіраўнікі рэгіёнаў, мясцовых органаў улады, прадпрыемстваў, прадстаўнікі дэпутацкага корпуса, Маладзёжнага парламента, бізнес-супольнасці, грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый, навуковых і аналітычных структур, спецыялісты-практыкі, грамадзяне. «У рабоце экспертнага савета могуць прымаць удзел нават проста жыхары нашай краіны, якія часам са сваімі ініцыятывамі, прапановамі звяртаюцца да нас. І мы разумеем, што гэты чалавек глыбока пагружаны ў праблему. Калі мы разглядаем пытанне на экспертным савеце, мы з вялікай радасцю запрашаем усіх, хто мае дачыненне да разгляду дадзенай тэматыкі», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Яна канстатавала, што для дэпутатаў Савета Рэспублікі важная работа з насельніцтвам, работа са зваротамі грамадзян, якой удзяляецца асаблівая ўвага. Прымяняюцца новыя формы, напрыклад, адзіны дзень прыёму грамадзян, калі ўсе сенатары выязджаюць у адну з абласцей і праводзяць прыём па асабістых пытаннях. «Мы бачым, якія праблемы ёсць у людзей, якія ідуць да сенатараў, членаў Савета Рэспублікі для таго, каб агучыць сваю праблему. Ёсць і прапановы, якія датычацца заканатворчай дзейнасці. Для нас гэта асабліва важна. І, вядома, дапамагчы людзям мы абавязаны — гэта наша задача», — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі. Яна таксама заўважыла, што адзін з асноўных напрамкаў работы сенатараў — работа з дэпутатамі ўсіх узроўняў, бо Савет Рэспублікі выконвае ролю каардынатара ў іх дзейнасці.

Наталля Качанава адзначыла, што зусім няшмат часу засталося да таго, як будзе дадзены старт электаральнай кампаніі, якая пройдзе ў новым фармаце. Гэта будзе адзіны дзень галасавання, што зацверджана ў новай рэдакцыі Канстытуцыі. «Гэта адказны перыяд у жыцці нашай краіны. Я гавару не толькі пра членаў Савета Рэспублікі, але і пра кожнага грамадзяніна краіны. Мы будзем выбіраць дэпутацкі корпус усіх узроўняў, пачынаючы ад сельскіх Саветаў і заканчваючы Саветам Рэспублікі. І, вядома, да гэтай работы трэба падыходзіць адказна. Перш за ўсё, павінны сёння актыўна працаваць у гэтым напрамку мясцовыя органы ўлады — гэта фарміраванне тэрытарыяльных акруг, падрыхтоўка да гэтага важнага палітычнага мерапрыемства», — сказала Старшыня Савета Рэспублікі. Яна зазначыла, што ў Палату прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі, мясцовыя Саветы дэпутатаў павінны прыйсці людзі, «якія жывуць праблемамі сваёй краіны, якія любяць людзей». Гэта работа вельмі няпростая, бо трэба ўзяць на сябе адказнасць за тых, хто аддаў за цябе голас. І гэта не проста «націскаць на кнопку і прыкалоць значок на грудзі», а жыць праблемамі і радасцямі людзей, бываць у калектывах, праводзіць прыёмы. Наталля Качанава прызналася, што на сваім вопыце ведае: дэпутацкая дзейнасць — гэта вельмі няпроста, але вельмі цікава. «Будучы членам Савета Рэспублікі, ты ўвесь час у гушчы падзей, якія адбываюцца ў тваёй краіне і на міжнароднай арэне. Ты павінен арыентавацца, павінен бачыць, разумець, спачуваць, суперажываць, радавацца. Гэта вельмі няпроста, але цікава. І я жадаю ўсім, хто зробіць такі выбар і захоча стаць дэпутатам, прымаць гэтае рашэнне вельмі ўзважана і абдумана», — сказала яна.

Спікер пацвердзіла, што члены Савета Рэспублікі падключацца да гэтай работы. «Дзесьці са свайго боку дадзім характарыстыку кандыдатам, таму што мы на працягу ўсяго гэтага часу працавалі разам з імі. І тым, хто ўжо быў дэпутатам, і тым, хто захоча стаць ім, каго мы бачылі ў справе. І вось тут важна не памыліцца», — сказала яна.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Варшаве ў маршы пратэсту ўзялі ўдзел каля мільёна чалавек



Маштабны мітынг пратэсту атрымаў назву «Марш мільёна сэрцаў». Гарадскія ўлады Варшавы заявілі, што ў найбуйнейшым за ўсю гісторыю мітынгу ў польскай сталіцы ўзялі ўдзел каля мільёна чалавек. Апытанні грамадскай думкі сведчаць, што ў краіне расце незадаволенасць ростам кошту жыцця і апасенні з нагоды эрозіі дэмакратычных стрыманняў і процівag. З меркаванняў бяспекі паліцыя перакрыла некаторыя вуліцы ў цэнтры Варшавы. Мітынгі прайшлі і ў іншых польскіх гарадах. «Будуць вялікія перамены. Гэта прыкмета адраджэння Польшчы», — заявіў лідар апазіцыйнай «Грамадзянскай платформы» і экс-прэзідэнт Еўрапейскага савета Дональд Туск напэўна, які сабраўся на цэнтральнай плошчы Варшавы. Як паведаміў Euronews, дэманстранты абвінавачваюць кіруючую партыю «Права і справядлівасць» у імкненні вывесці краіну з ЕС, парушэнні свабод, фінансавых махінацыях, абмежаванні правоў жанчын. «Хтосьці вырашыў разбурыць дэмакратыю ў Польшчы», — заявіў удзельнікам мітынгу мэр Варшавы Рафал Тшаскоўскі. Відавочна, што з набліжэннем парламенцкіх выбараў, якія пройдуць у Польшчы 15 кастрычніка, пашыраецца пратэсная хваля. Папярэдні марш, які быў праведзены «Грамадзянскай платформай» 4 чэрвеня, па некаторых ацэнках, сабраў паўмільёна чалавек.

## Лідар Нігера заявіў, што французскія ваенныя не здолелі перамагчы тэрарыстаў



Абдурахман Тчыяні заявіў, што французскія ваенныя, якія рыхтуюцца да ад'езду з яго краіны, так і не здолелі дапамагчы перамагчы тэрарызм. «Мала таго, што яны не здолелі перамагчы тэрарызм, дык яшчэ і самі тэрарыстаў стала больш, — цытуюць яго французскія СМІ. — Паколькі французы, якія знаходзіліся ў нас, каб змагацца супраць тэрарызму, у аднабаковым парадку спынілі супрацоўніцтва з намі, то іх знаходжанне ў Нігеры падыходзіць да канца». Паводле яго слоў, улады Нігера «займаюцца падрыхтоўкай» да ад'езду французскіх вайскоўцаў. Тчыяні адзначыў, што ваенныя здзейснілі пераварот у Нігеры якраз таму, што ўлады не прыслухоўваліся да іх меркавання па пытаннях бяспекі краіны. Французскія СМІ адзначаюць, што гэтыя заявы Тчыяні зрабіў журналістам, размаўляючы не на французскай, а на карэнных мовах Нігера.

## Закрылася найбуйнейшае газавае радовішча Еўропы




Здабыча газу ў нідэрландскім Гронінгене, дзе размяшчаецца найбуйнейшае ў Еўропе радовішча, днямі завяршылася. Аб гэтым паведаміла Нідэрландская тэлерадыёвяшчальная карпарацыя (NOS). Як вядома, гіганцкае газавае радовішча ў Гронінгене на поўначы Нідэрландаў было адкрыта ў 1959 годзе, яго распрацоўка пачалася ў 1963-м. Пачатковыя запасы газу тут складалі 2,9 трыльёна кубаметраў. На працягу многіх гадоў радовішча было асноўнай крыніцай газазабеспячэння Паўночна-Заходняй Еўропы, аднак з-за шматлікіх землятрусаў у 1990-х улады Нідэрландаў вырашылі паступова абмяжоўваць здабычу. У апошнія месяцы з 26 аб'ектаў радовішча працавалі толькі пяць. У выніку спыніліся і яны. Аднак мясцовыя жыхары ставяцца да гэтай весткі з недаверам і лічаць, што здабыча можа быць аднаўлена. Па запэўненнях урада, гэта можа адбыцца толькі ў складаных сітуацыях — «напрыклад, калі наступнай зімой некалькіх дзён будзе мароз звыш 6,5 градуса на працягу дня».